# Батлейка
## *як*
# Сямейны тэатр

*Ганна Выгонная*





Батлейка як сямейны тэатр/2017 г.
Укладальнік: Ганна Выгонная
Фота: Аляксандр Лубнеўскі, Сямён Шаўцоў, Людміла Скакун
Макет: Ганна Выгонная
Малюнкі з калекцыі мірскага тэатра-студыі
«Батлейка» 1986-2011 гг.

Два гады запар у рамках праекта «Развіццё патэнцыялу сеткі сямейных клубаў у Чарнобыльскай зоне з мэтай паляпшэння сацыяльна-эканамічнай сітуацыі» у Брагінскім раёне праводзіўся цыкл заняткаў і майстар-класаў па адраджэнні традыцыйнага лялечнага тэатра батлейкі. У выніку было створана некалькі тэатраў, якія актыўна дзейнічаюць у в. Мікулічы і г.п. Брагін. Цікавасць да тэатра ў мясцовых жыхароў працягвае расці і спараджае жаданне ствараць хатнія тэатры.
Дадзенае выданне было падрыхтавана як практычны дапаможнік па стварэнні мабільнага хатняга лялечнага тэатра.
Для супрацоўнікаў музеяў і бібліятэк, краязнаўцаў, выкладчыкаў і навучэнцаў школ, ССНУ, ВНУ, а таксама для шырокага кола чытачоў.

# Прадмова



Брагінскія батлейкі. 2016 г.

Так атрымалася, што я, мастак па адукацыі, яшчэ ў мінулым стагоддзі, у 1990 годзе, захапілася лялечным тэатрам батлейкай. Сакрэты гэтага рамяства я пераймала ў маёй настаўніцы, архітэктара-рэстаўратара Галіны Жаровінай. Наша творчая суполка існавала пры Мірскай рэстаўрацыйнай вучэльні, дзе была створана школа мірскай батлейкі.

У 2015 годзе мне прапанавалі адрадзіць гэты тэатр на Брагіншчыне. У выніку з’явілася брагінская батлейка. Ёй і прысвечаны гэтыя старонкі.



Выступленне мірскай батлейкі ў Літоўскім музеі тэатра, музыкі і кіно са спектаклем «URBI ET ORBI», прысвечаным гісторыі Нясвіжа. Ганна Выгонная і Аляксей Урулеўскі. 2004 г.



Батлеечны спектакль «Вечар у Паўночных Афінах, або Сон Антоські» у гонар нараджэння Клеафаса Агінскага. Сяргей Верамейчык з вучнямі. Залессе. 1996 г.



Хатняя батлейка Галіны Жаровінай з лялькамі для інтэрмедыі па матывах спектакля Уршулы Радзівіл.



Лялечны тэатр батлейка мае сваю вельмі старажытную гісторыю, якой прысвечаны шэраг даследаванняў. Асабліва карыснымі для яе вывучэння з’явіліся для нас кнігі беларускага тэатразнаўцы Гурыя Барышава.

З розных беларускіх рэгіёнаў захавалася шмат этнаграфічных запісаў класічнай батлеечнай драмы «Цар Ірад» і жартоўных бытавых інтэрмедый, якія граліся пасля яе.

У час адраджэння батлейкі ў 90-я гады XX стагоддзя замест інтэрмедый былі створаны цэлыя спектаклі. Так, у Міры і Залессі іграліся спектаклі, звязаныя з гісторыяй навакольных мясцін.

Малюнкі з калекцыі мірскага тэатра-студыі «Батлейка»





На Беларусі адраджэнне батлейкі пачалося ў 90-я гады XX стагоддзя. Брагінскага раёна гэтая хваля дасягнула ў 2016-м.





Рэпетыцыя ў Брагіне. 2016 г.

## Сінтэз

Батлейка захапляе нас моцнай энергіяй. Разам з ёю мы ператвараемся ў творцаў: архітэктараў, скульптараў, дэкаратараў, актораў, музыкаў.
Бо, на думку мастацтвазнаўцаў, яна нясе да нас праз стагоддзі згублены сінтэз мастацтваў.





Хатняя батлейка
Ганны Выгоннай





Скрыня брагінскай
батлейкі



# Батлеечная скрыня

Каб прасачыць, як нарадзілася форма брагінскай батлейкі, трэба звярнуцца да 1998 года, калі калектыў творчай студыі з Міра зрабіў батлейку са звычайнай паштовай скрыні і аздобіў яе фанцікамі ад цукерак. Тая батлейка была падорана мне на дзень нараджэнне сына, а спектакль меў назву «Як Ганна імя шукала». Канструкцыя атрымалася партатыўная і ўдалая: верхні ярус лёгка здымаецца і хаваецца ў ніжні. На выснове гэтай канструкцыі і была распрацавана скрыня брагінскай батлейкі.

Брагінскія лялькі зроблены па магілёўскай традыцыі. Яны маюць невялікую драўляную аснову, якая падчас грання дазваляе перадаваць разнастайныя рухі персанажаў.





Малюнкі з калекцыі
мірскага тэатра-студыі
«Батлейка»





Батлейка
сямейнага клуба
вёскі Мікулічы
Брагінскага раёна



## Чароўная скрыня



Маці Боская Траеручыца,
палескі народны жывапіс

Аздабленне скрыні батлейкі – справа зусім няпростая. Часам бывае, што багата ўпрыгожаная скрыня выглядае ярчэй за лялькі і перастае быць дэкарацыяй-фонам для дзеючых асоб.
Выкарыстанне дэкаратыўных матываў народнага Палескага іканапісу – адзін з удалых прыкладаў афармлення брагінскай батлейкі.



Брагін. 2016 г.

Для далейшай працы над лялькамі спатрэбіцца вялікая колькасць лапікаў тканіны. І лепшыя касцюмы будуць створаны менавіта са старой сямейнай вопраткі.

## Батлеечныя лялькі

Батлеечнік, калі апранае лялькі, ператвараецца ў тэатральнага мастака і робіць касцюмы для герояў спектакля на фоне дэкарацый сваёй батлейкі.

На фотаздымках унізе адлюстраваны шлях падбору тканіны па колерах і фактуры для вопраткі лялек Марыі і Іосіфа. І не выпадкова побач з імі паказаны лялькі Анёла і Цара Ірада: колеры адзення павінны адрозніваца, ствараць ансамбль.











*Анёл:*

*«Надзежда наша, савяршыся!*
*Спас роду чалавечаскаму, радзіся!*
*Прыйшоў на зямлю важдзяленны свет!»*



## Лялькі Марыя, Іосіф і Немаўля Хрыстос

*Анёл:*

*«Дзе Хрыстос нарадзіўся,*
*Звязда ясна вассіяла,*
*Тром Царам пуць указала.*
*Над вярцепам сіяет,*
*Хрыста Цара ўяўляет!»*

Марыя, Іосіф і Немаўля Хрыстос – лялькі з верхняга яруса батлейкі, з батлеечных Нябёсаў. Гэта адзіныя нерухомыя лялькі ў нашым тэатры. На працягу спектакля яны – галоўныя дзеючыя асобы і адначасова маўклівыя сведкі ўсіх падзей.



# Лялька Анёл



Які Ён, батлеечны Анёл?
Гэта Веснік вялікай падзеі
і адначасова суровы суддзя цара Ірада.

Вось такія атрымаліся Анёлы – жыхары батлеечных Нябёсаў. Цяжка ўявіць, што ўсе драўляныя загатоўкі для лялькі былі аднолькавыя. Кожны батлеечнік ствараў вобраз па-свойму.



***Анёл:***

***«Какая радасть***
***здесь адкрылась!***
***Какой васторг!***
***Я зру прадмет!»***

Не падумайце, што гэта памылкі ў тэксце. На самой справе батлеечныя лялькі размаўляюць на розных мовах, якія гучалі ў нашых мясцінах. Анёл гаворыць на трасянцы.





***«Ах, Цар! Цар Ірад!***
***Загінуў ты бяспечна,***
***страціў Неба навечна!»***

На нашых першых рэпетыцыях знайшоўся цікавы сцэнічны ход: дзея адначасова адбываецца на чатырох батлейках, чатыры Анёлы лунаюць у батлеечных Нябёсах, шматгалосым рэхам гучаць урачыстыя словы.




Малюнкі з калекцыі
мірскага тэатра-студыі
«Батлейка»

# Лялька Тры Цары

*Хор:*

***«Шэдша Трые Цары***
***ка Хрысту з дарамі.***
***Анёл ім явіўся,***
***гдзе Хрыстос нарадзіўся***
***Звязда ясна ваccіяла,***
***тром царам пуць указала.***
***Над вярцепам сіяет,***
***Хрыста цара ўяўляет!»***





Узорам для брагінскай лялькі Тры Цары была лялька са старажытнай магілёўскай батлейкі. На адным шпяньку разам размешчаны тры фігуры: Бальтазар, Гаспар і Мельхіёр.

# Лялькі Ірад і Чорт

Малюнкі з калекцыі
мірскага тэатра-студыі
«Батлейка»







**_Ірад:_**

**_«А што мне да неба,
калі шкада кароны?
Лепш быць каранаваным,
чым выратаваным!»_**







Надзея Гананайка. Брагін. 2016 г.

**_Чорт:_**

**_«Мэнгэуш, слаўны манарх!
Скажы сваім рыцарам
ісці ў Віфліем ды забіць
усіх навароджаных!»_**



# Лялька Рахіль




Малюнак з калекцыі мірскага тэатра-студыі «Батлейка»



Сцэна з Рахіллю ў батлейцы кульмінацыйная!

Лялька Рахіль – маладая маці з дзіцём на руках, увасабленне жаночай роспачы і пакуты.
Яна заўжды нагадвае звычайную беларускую сялянку.
Цікава, што ў брагінскіх батлеечнікаў гэтая лялька атрымалася адной з першых.

***Рахіль:***

***«О, прасвятлейшы Цару,<br>усясільнейшы гаспадару!<br>Як можаш ты на троне прабываць<br>і нявінных дзетак забіваць!<br>Памілуй, памілуй чада майго!»***



# Лялькі Салдат і Смерць












Малюнкі з калекцыі
мірскага тэатра-студыі
«Батлейка»

***Смерць:***
***«Аз есмь манархіня ўсяго жывога!***
***Усе князі і цары пад уладай маёю!***
***Усіх, каго захачу, знішчу касою сваёю!»***

***Салдат:***
***«О, грозны цар Ірад!***
***У Віфлеемскія страны мы ўжо сходзілі,***
***усіх двухгадовых дзяцей перабілі!»***

# Лялькі Лэйба і Сора



Старыя шпалеры, фанцікі ад цукерак, залатая і срэбраная фальга – усё гэта самыя лепшыя матэрыялы для аздаблення батлеечнай скрыні.





Сцэна з хатняй батлейкі Галіны Жаровінай. Менавіта яна рэканструявала батлеечныя вобразы Лэйбы і Соры (аўтэнтычныя лялькі не захаваліся). Менавіта яны былі для нас узорам для стварэння брагінскіх лялек.

***Лэйба:***

***«Сора, Сора езермойс! Нойдзем талмуд гройс! А ці ведаеш ты, Сорачка, колькі месяцаў мінулася, як тое дзіця нарадзілася?»***

***Сора:***

***«Ужо дзевяць месяцаў мінулася...»***

Калі батлеечнік кажа за ляльку Лэйбы, то ён імітуе мову ідыш, якая калісьці была вельмі распаўсюджана ў нашых мясцінах.

# Лялькі Пан і Паненка



Вобразы лялек батлеечных інтэрмедый нараджаюцца нейкім чароўным спосабам. А часам выпадкова сустракаюцца са сваімі «правобразамі».





Малюнкі з калекцыі мірскага тэатра-студыі “Батлейка”



***Паненка:***

***«Я так хвора, пахудзела,***
***на мне сарочка павужэла, раней***
***было тры складкі,***
***а зараз у нацяжку гладка.»***

***Пан:***

***«Я Пан-лекар, галоўны аптэкар.***
***Умею лячыць, кроў мячыць, корпіі***
***ўстаўляць, жывых людзей на той***
***свет адпраўляць!»***



Батлейка мірскай студыі
і хатняя батлейка
сям'і Паповых







Хатняя батлейка сям'і Юнгіных на фестывалі «Нябёсы». 2017 г.

Калісьці ў мірскай батлеечнай студыі была прапанавана жартоўная праграма – «У кожную беларускую сям'ю па батлейцы». І сапраўды батлейка – гэта перш за ўсё сямейны тэатр, які аб'ядноўвае нас падчас свята і падчас падрыхтоўкі да яго. Ён дазваляе ў наш камп'ютарны час сабраць усю сям'ю для агульнай дзеі і дакрануцца да вытокаў калектыўнай творчасці.

У канцы гэтай кніжкі вы знойдзеце «выкрайку» самай простай маленькай батлеечнай скрыні, якая дапаможа вам стварыць свой хатні сямейны тэатр.



Дадзеная публікацыя была падрыхтавана пры падтрымцы
Еўрапейскага саюза. Адказнасць за змест дадзенай
публікацыі нясе грамадская арганізацыя
«Беларускі зялёны крыж», і яна ні ў якой ступені не
адлюстроўвае пункт гледжання Еўрапейскага саюза.

"БЕЛОРУССКИЙ ЗЕЛЁНЫЙ КРЕСТ"